Тэматыка допісаў у рэдакцыю за 1912 год адлюстроўвала грамадска-палітычныя і сацыяльныя падзі: выбары ў Дзяржаўную думу і мясцовую ўладу, несправядлівасць чыноўнікаў, махлярства ўладаў, наватарства ў вядзенні гаспадаркі, п'янства і забойствы, самагубствы, кліматычныя анамаліі, надзвычайныя здарэнні, дабрачыннасць.

Пэўная ўвага надавалася пытанням асветніцка-культурнага жыцця: літаратурныя вечары, пастаноўка спектакляў, адкрыццё школы народнай гаспадаркі, праблемы беларускай мовы, праблемы беларускай культуры, неадукаванасць і бескультур'е сялянства.

Па-ранейшаму, значнае месца на старонках "Нашай Нівы" адводзілася мастацкім творам (у 1912 годзе іх было змешчана 19 і 1 публіцыстычны артыкул). Яны належалі як сталым аўтарам, так і тым, хто спрабаваў свае сілы ў літаратурнай творчасці: А. Петрашкевічу, Змітраку Бядулю, Міхалку Галцы, Старому Вераб'ю, Ядвігіну Ш.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што "Наша Ніва" адыгрывала значную ролю ў жыцці Вілейскага павета, а актыўнасць карэспандэнтаў залежала ад грамадска-палітычных і сацыяльна эканамічных падзей пачатку XX стагоддзя (1912 г.).

## Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Экаперспектыва, 2005. – Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (XVI – пачатак XX ст.). – 519 с.
2. Наша Ніва. – Вып. 5, 1912–915, 1920 гг. (факсімільнае выданне). – Мінск : Навука і тэхніка, 2009.
3. Наша Ніва. Вып. 1, 1906–1908 гг. (факсімільнае выданне). – Мінск : Навука і тэхніка, 1990.
4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Вілейскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 345 с.


# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ РЫСЫ ХАРАКТАРУ БЕЛАРУСА Ў РАМАНЕ К. ЦВІРКІ "ВОЎЧАЯ ВЫСПА"


*С. А. Янушкевіч*

*ДУА "Сярэдняя школа № 138 г. Мінска"*

*Навук. кір. – Н. У. Зарэцкая, настаўнік беларускай мовы і літаратуры*



**Анатацыя.** У артыкуле даследуюцца рысы нацыянальнага характару беларусаў на аснове крытычнага аналізу сучаснага рамана на гістарычную тэму Кастуся Цвіркі «Воўчая выспа», а таксама артыкулаў і даследаванняў навукоўцаў па тэме «Нацыянальны характар беларусаў».

**Ключавыя словы:** нацыянальны характар; радзіма; любоў да зямлі; рабінзанада; паяднанасць чалавека і прыроды.

Адным з маладаследаваных твораў у сучаснай беларускай літаратуры з'яўляецца раман Кастуся Цвіркі «Воўчая выспа», у якім апісваюцца падзеі 20 – 30-х гадоў XX стагоддзя на тэрыторыі нашай краіны (калектывізацыя, раскулачванне). Раман Кастуся Цвіркі – і трагедыйны, і сямейны, і шляхетны, і філасофскі, і нацыянальны, а перш за ўсё неверагодна чуллівы да людзей, жыцця, прыроды, радзімы, сялянскай працы. Гэты твор можна назваць таксама выдатным прыкладам рабінзанады ў беларускай літаратуры.

Беларус, паляшук, селянін – зусім не казачны асілак, аднак жа волат духу. Яго дзед Базыль – паўстанец, воін арміі Кастуся Каліноўскага; яго бацька Сцяпан – моцны гаспадар, а значыць – вораг сталінскай улады; яго дзядзька Паўлюк – салдат слуцкага войска, якое змагалася за беларускую ўладу і беларускую дзяржаву... Ён мае цвёрдую волю і пяшчотнае сэрца; яго адносіны да жонкі Хрысціны, да сваіх дзяцей і блізкіх, нават да свойскай жывёлы і дзікіх звяроў надзіва кранальныя.

Такі ён – Ігнась Караленя, галоўны герой рамана Кастуся Цвіркі «Воўчая выспа». У творы Ігнась схаваўся ад энкавэдыстаў у непраходным балоце, пасярод якога знаходзіцца знакамітая Воўчая выспа, на якой мелі прытулак у свой час паўстанцы Кастуся Каліноўскага. Патаемную дарогу туды некалі паказаў Ігнасю Караленю дзед Базыль. «Ляжыць яна пасярод самага, мусіць, вялікага на Палессі балота, якое называецца гіблым, а яшчэ – Чортавым. Калі ён наважыўся вярнуцца з Сібіры дадому, дык думаў якраз пра яе, гэтую выспу, дзе можна надзейна схавацца ад людскога вока» [2, с. 58].

Характар галоўнага персанажа, беларуса Ігнася Караленi, захапляе сваімі як звычайнымі для беларуса рысамі (дабрыня, любоў да прыроды, працавітасць), так і рысамі, уласцівымі далёка не кожнаму сучаснаму чалавеку (здольнасць выжываць ва ўмовах дзікай прыроды, уменне знайсці агульную мову з ваўкамі…). Твор заканчваецца трагічна (галоўны герой свядома гіне ў балоце, не жадаючы трапіць у рукі энкавэдыстаў). На жаль, гэта быў такі час, калі просты і шчыры чалавек вымушаны быў мяняць чалавечае асяроддзе вакол сябе на воўчую зграю...

У характары Ігнася Караленi вызначальнай можна назваць такую рысу характару, як шчырая любоў да зямлі, да роднага кутка. Прывязанасць нашых продкаў да зямлі была ледзь ці не містычнай. Імкненне мець уласны кавалачак зямлі, беражлівае, любоўнае стаўленне да яе з'яўлялася адной з найбольш выразных рысаў беларускага нацыянальнага характару. Мары пра сваю зямлю, на якой ён будзе вольным гаспадаром, хвалююць і Ігнася, калі ён апынуўся на Воўчай выспе. «Хто не ведае, што значыць для селяніна зямля? Яна – аснова асноў яго жыцця, яго быту, яго дастатку…» [2, с. 74]. Жончына маці расказвала Ігнасю, як рады былі яе продкі, беззямельныя арандатары панскіх фальваркаў, калі ім удалося купіць за немалыя грошы ў пана па паўвалокі свежага пацяробу. Апынуўшыся на Воўчай выспе, Ігнась думаў: «Хіба ж не здолее ён, Ігнась,

разрабіць тут зямлю?». І доўга не мог заснуць, «разварушаны салодкімі марамі пра сваю, самім разробленую зямлю, пра вольнае на ёй гаспадаранне» [2, с. 75].

Яшчэ адна характэрная рыса беларусаў – гэта іх працавітасць, працаздольнасць. Некаторыя даследчыкі на падставе параўнальнага аналізу рабілі выснову аб тым, што беларус – гэта, па сутнасці, самы працавіты чалавек, якога бедная глеба і прырода-мачыха навучыла небываламу цярпенню, бязмежнай гатоўнасці да працы. Ігнась Караленя, як і большасць беларусаў ва ўсе часіны, вызначаецца незвычайнай працавітасцю, працаздольнасцю. «…Як жа лёгка, з якой ахвотай ён усё ўзараў бы і засеяў! Ён і сам, здаецца, ажыў бы за такой работай, забыў бы ўсё ліхое. І зноў пачуў бы сябе чалавекам» [2, с. 45].

Неад’емнай рысай беларускага характару з’яўляецца міралюбнасць, памяркоўнасць, талерантнасць да прадстаўнікоў розных нацый, канфесій, да людзей з іншым складам мыслення, светаўспрымання. Так і Ігнась Караленя – чалавек незласлівы, незлапамятны і няпомслівы. Калі ён сустракае добразычлівае стаўленне да сябе, ён заўсёды адказвае тым жа. Колькі няшчасцяў нацярпеўся ад энкавэдыстаў Ігнась, але ў канцы твора, ідучы пад канвоем, з цеплынёй адчувае чалавечныя адносіны маладзенькага міліцыянера, «які не ў прыклад сваім таварышам так сур’ёзна, без ніякага смеху слухаў яго ў хаце пра выгадаванага ваўкамі сына» [2, с. 246]. У чытача ж, нягледзячы на трагічны фінал твора, з’яўляецца надзея на тое, што менавіта гэты маладзенькі міліцыянер здолее перадаць жонцы Ігнася яго пісьмы. «Не бачыў толькі Ігнась тады, як гэты міліцыянерык пры аглядзе хаты неўпрыкмет запіхнуў у свой заплечны ранец знойдзены ў шуфлядзе шафы яго сшытак-паўсядзённік з запісанымі ў ім і не адасланымі пісьмамі Хрысціне» [2, с. 246].

Разам са станоўчымі якасцямі звяртаюць на сябе ўвагу і адмоўныя якасці характару беларуса. Нерашучасць, няўпэўненасць і некаторая інертнасць, магчыма, з’яўляюцца вынікам празмернай талерантнасці, добразычлівасці і памяркоўнасці беларускага народа. «Калі б Ігнась мог паглядзець на сябе збоку, дык зразумеў бы, што вельмі недаацэньваў сябе як кавалера. Быў ён, як гэта кажуць, статны хлопец і даволі паглядны. У меру высокі, з прыгожай русявай чупрынай, з тонкімі рысамі твару і прамым носам. Бяда толькі, што залішне быў сарамяжлівы, нясмелы. Ён сам гэта ўсведамляў і не мог нічога зрабіць з сабой, мучыўся ад сваёй нерашучасці» [2, с. 27].

Уражваюць дабрыня і міласэрнасць Ігнася ў адносінах да жывёл і птушак. Гэтыя якасці ў час яго жыцця на Воўчай выспе не давалі яму магчымасці здабываць сабе мяса для харчавання. Але тут яму нечаканa дапамагае знойдзены на выспе, выхаваны ваўкамі маленькі сын: «Хрысцінка, спяшаю расказаць табе пра здарэнне, ад якога ўсё яшчэ не магу апамятацца… У адну з маіх лоўчых ямаў уваліўся малады казёл. Я прывёў яго на вяроўцы дадому. Толькі не ведаў, што з ім рабіць. Ты ж знаеш, як цяжка мне было дома адсекчы на калодцы нават галаву курыцы. А гэта ж казёл! І так патрэбна нам тут усім мяса… І тут адбылося нешта неверагоднае. Наш малы хлопчык маланкай кінуўся на козліка, спрытна ўчапіўся ў яго аберуч, мігам паваліў вобзем і ўпіўся

зубамі козліку ў горла… Як бы там ні было, а сын памог бацьку здабыць мяса, пасарамаціў мяне» [2, с. 189].

Нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, нацыянальны нігілізм – рысы, якія таксама ўласцівы беларускаму нацыянальнаму характару. У рамане з дзяцінства Ігнась не ўсведамляе сябе беларусам, але ў час вучобы ва ўніверсітэце, цікавячыся гісторыяй свайго дзеда «мяцежніка» Базыля, знаёміцца з архіўнымі дакументамі, кнігамі, якія дапамаглі яму даведацца пра гісторыю самастойнай беларускай дзяржавы. «Усе падручнікі ўбівалі школьнікам і студэнтам у мазгі, што Беларусь у мінулым была лапатная, адсталая краіна, што яна нібыта не мела сваёй дзяржаўнасці, што толькі «Вялікі Кастрычнік» яе даў беларусам, даў БССР. Аказалася ж, што беларусы з вякоў жылі самі сабой. Спярша ў іх было Полацкае княства, а потым – Вялікае Княства Літоўскае, магутная беларуская дзяржава, слава пра якую грымела па ўсёй Еўропе дый у свеце ні мала ні многа – пяцьсот гадоў. Цэлае паўтысячагоддзе!» [2, с. 87]. Але калі Ігнась пачаў расказваць пра даўнейшую беларускую дзяржаву студэнтам, універсітэцкія ідэолагі пачалі абвінавачваць Ігнася ў нацыяналізме. Гэта была адна з прычын, чаму Ігнась кінуў вучобу і вярнуўся ў сваю Волю, каб рабіць на зямлі і быць падалей ад палітыкі.

У рамане ёсць сцэны, якія без слёз чытаць немагчыма: шукаючы згубленых на этапе бацькоў, Ігнась Караленя знаёміцца на прыстані з былым вартаўнікам, сям'ю якога яшчэ ў царскія часы з-пад нашага Барысава заслалі ў Сібір. Вартаўнік забыў беларускую мову, аднак жа памятае, што ён літвін; слухаючы Ігнася, успамінае матчыны словы: жыта, калыска, кужаль, бусел, крынічка, журавіны... «Вочы дзядка свяціліся, сам ён нібы ажыў, скінуўшы з сябе ранейшую панурасць, абыякавасць да ўсяго» [2, с. 110]. Ігнась нават абуджае ў ягонай душы і забытую «Перапёлачку»... «Боже мой, ведь это всё мамины слова! Когда ты рассказывал, я как будто услышал свою мать, своего отца. Они точно так говорили. Я был мальчиком, когда их не стало. Поэтому забыл уже их говор, наш литвинский, или, как ты называешь, белорусский язык. Забыл самое дорогое» [2, с. 110].

Падагульняючы вышэй сказанае, можна назваць наступныя станоўчыя рысы беларуса ў рамане: шчырасць, павага да памерлых продкаў, паяднанасць з прыродай, жыццястойкасць, прывязанасць да зямлі, працавітасць, талерантнасць, міралюбнасць, дабрыня, міласэрнасць. Акрамя гэтага, галоўны герой надзелены і незвычайнымі станоўчымі рысамі: здольнасцю выжываць ва ўмовах дзікай прыроды, уменнем знайсці агульную мову з ваўкамі і з іншымі жывёламі.

Сярод асноўных адмоўных якасцей характару беларуса ў рамане вылучаюцца нерашучасць, няўпэўненасць, некаторая інертнасць, нізкі ўзровень нацыянальнай свядомасці.

Такім чынам, у характары галоўнага героя рамана, як і ў беларускім нацыянальным характары адначасова, узаемазвязана існуюць розныя, а часам і супрацьлеглыя рысы.

Раман Кастуся Цвіркі на прыкладзе паводзін галоўнага героя на бязлюдным востраве сярод балот вучыць, як выжыць у невыносных умовах. Гэты твор пра чалавека і яго паяднанасць з прыродай павышае таксама экалагічную граматнасць чытача. Гэта асабліва важна ва ўмовах крызісных сітуацый. Твор садзейнічае псіхалагічнай пераарыентацыі людзей, мабілізуе іх на абарону прыроды і тым самым садзейнічае прагрэсу грамадства ўвогуле.

## Літаратура


1. Дубовік, А. І. Асаблівасці нацыянальнага характару беларусаў / А. І. Дубовік // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: материалы междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ, Минск, 15–16 апр. 2004 г. / редкол.: В. Н. Сидорцов. (отв. ред.) [и др.] – Минск: БГУ, 2004. – С. 203–205.
2. Цвірка, К. Воўчая выспа: раман / К. Цвірка. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 248 с.